# Жадаем Вам...








Фота В. ЧАРНЯЎСКАГА.

ПАВАЖАНЫЯ ПЕРШАКУРСНІКІ!

Усяго некалькі дзён назад вы паспяхова вытрымалі ўступныя экзамены і гэтым заслужылі права вучыцца ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна. Заўважу: ганаровае права. Дазвольце сардэчна павіншаваць вас з высокім званнем савецкага студэнта. Пастарайцеся выдатнай вучобай, актыўнай грамадскай і навукова-даследчай работай, прыкладнымі паводзінамі апраўдаць яго.

Вам на працягу пяці гадоў давядзецца развіваць традыцыі старэйшай вышэйшай навучальнай установы рэспублікі, памнажаць яе поспехі, словам, рабіць усё для таго, каб наш універсітэт быў не толькі флагманам навукі, але і флагманам перабудовы.

## Памнажайце традыцыі!

Перад вамі стаяць адказныя і складаныя задачы. Краіне патрэбны спецыялісты, якія б добра валодалі асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, дасканала ведалі сваю спецыяльнасць, здольныя пастаянна абагачацца новымі ведамі. У нашым універсітэце створаны ўсе ўмовы для паспяховай вучобы, навукова-даследчай работы студэнтаў. Актыўна працуюць студэнцкія навуковыя таварыствы і гурткі, праводзяцца конкурсы работ па грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных дысцыплінах, выстаўкі студэнцкай навуковай творчасці, алімпіяды. Словам, разнастайнае, шматграннае жыццё адкрывае перад студэнтамі новыя гарызонты ў авалоданні ведамі.

Але універсітэт не толькі кузня высокакваліфікаваных спецыялістаў. Перад ім пастаўлены і вялікія выхаваўчыя задачы. Трывала ўвайшлі ў жыццё універсітэта грамадска-палітычная практыка, работа ў будаўнічых і педагагічных атрадах, факультэты грамадскіх прафесій. Усё гэта накіравана на фарміраванне палітычных, грамадзянскіх, маральных якасцей студэнцкай моладзі.

Зараз у краіне ідзе складаны працэс перабудовы, у якую вы, першакурснікі, сваёй мэтанакіраванай, напружанай вучобай, высокай грамадскай актыўнасцю павінны ўнесці дастойны ўклад. У гэтым — залог вашых будучых поспехаў!

**А. ПУХАЎ,**
інструктар камітэта камсамола.

## Каб успаміны былі прыемнымі

ПАВАЖАНЫ ПЕРШАКУРСНІК! Ты ступіў на новую дарогу свайго жыцця — дарогу пазнання і адкрыцця. Студэнцтва — самая цудоўная пара, і я ўпэўнены, што гэты час на ўсё жыццё застанецца ў памяці кожнага. Пастарайся зрабіць так, каб успаміны былі прыемнымі. А для гэтага імкніся насыціць студэнцкія гады цікавымі і карыснымі справамі, не растрачвай свае сілы дарма.

Жадаю табе, дружа-першакурснік, няўрымслівасці, гарэння, вечнага пошуку. Ніколі не спыняйся на дасягнутым. Імкніся кожны дзень адкрываць нешта новае для сябе і рабіць хоць маленькі, але крок наперад. І я ўпэўнены, што цябе ніколі не наведае расчараванне, ты не страціш веры ў свае здольнасці, цікавасці да выбранай спецыяльнасці.

І апошняе. Калі ты сапраўды хочаш адчуць усю асалоду студэнцкага жыцця, не абмяжоўвайся вучобай. Удзел у студэнцкім будаўнічым руху, камсамольская і прафсаюзная работа, мастацкая самадзейнасць...

Карыстаючыся выпадкам, хачу сказаць, што ў БДУ імя У. І. Леніна ў мастацкай самадзейнасці ўдзельнічаюць больш за чатыры тысячы студэнтаў. Табе таксама будуць заўсёды рады. Калі ты аматар танцаў, калі ласка ў народны ансамбль танца «Крыжачок», любіш іграць — да тваіх паслуг народны аркестр народных інструментаў, не ўяўляеш сябе без песні — цябе чакаюць у народнай харавой капэле ці фальклорна-этнаграфічным ансамблі «Неруш», ёсць акцёрскі талент — прыходзь у народны тэатр універсітэта.

**У. МАКАРЭВІЧ,**
дырэктар студэцкага клуба.

## Не праглядзець галоўнага

БЫЦЬ СТУДЭНТАМ універсітэта — вялікі гонар. Разам з тым гэта да многага абавязвае. І перш за ўсё абавязвае вучыцца з поўнай аддачай сіл. Уменне добрасумленна працаваць — гэта абавязак не толькі перад грамадствам, але і перад сваім сумленнем.

На мой погляд, галоўнае ў студэнцкім жыцці — захопленасць: захопленасць вучобай, навукай, спортам. Без гэтага няма і не можа быць паўнакроўнага студэнцкага жыцця. З першых дзён вучобы ва універсітэце неабходна настроіцца на «студэнцкую хвалю».

У юнацтве думаецца, што ўсё яшчэ наперадзе, што сённяшні дзень — гэта яшчэ не сапраўднае жыццё, гэта яго чарнавік, які можна перапісаць. А з узростам становіцца зразумела, што ніякіх чарнавікоў няма. Студэнцкае жыццё — гэта не толькі падрыхтоўка да заўтрашняга дня. Гэта ўжо сёння — час актыўнага назапашвання ведаў, прафесійных навыкаў, выпрацоўкі дакладных ідэйных і грамадзянскіх пазіцый.

Студэнт павінен сістэматычна займацца самавыхаваннем. У поўным сэнсе чалавек сам «робіць» самога сябе.

Мы часцей павінны заглядваць у саміх сябе і старацца не прапусціць галоўнага. Патрэбна знаходзіць у сабе самае лепшае. Гэты няпроста, часам вельмі цяжка, але неабходна. Жыццё чалавека ў нейкай ступені ёсць пастаянная барацьба з самім сабой, барацьба за фарміраванне станоўчых і выкараненне адмоўных звычак.

Вельмі важна, каб у кожнага з вас сумленне ніколі не спала. Сумленны студэнт ніколі не стане на лекцыях, семінарах і практычных занятках займацца пабочнымі справамі, рабіць прагулы.

Сапраўднага студэнта я бачу чалавекам сацыяльна актыўным. Але быць толькі знешне актыўным — тое ж самае, што жыць «па святочнаму календару», супраць чаго ў свой час выступаў У. І. Ленін.

Студэнт універсітэта павінен валодаць трывалым ідэйна-маральным патэнцыялам, добра арыентавацца ў патоку навейшай навуковай інфармацыі, быць палітычна адукаваным. Сёння, як ніколі раней, краіне патрэбны не проста добрыя спецыялісты: патрэбны людзі творчыя, з нешаблонным мысленнем.

Кароткая студэнцкая пара — усяго пяць гадоў. Але след яна пакідае на ўсё жыццё. Кожны, хто быў студэнтам, ведае: для яго гэтыя гады былі самымі лепшымі.

Дарагія сябры! Прыміце самыя сардэчныя віншаванні з пачаткам новага вучэбнага года. Імкніцеся за студэнцкія гады як мага больш пазнаць, убачыць, зразумець. Няхай кожны, хто сёння крочыць да вяршынь навукі, з гонарам выканае свой абавязак перад Радзімай.

**В. ЦІХІНЯ,**
дэкан юрыдычнага факультэта,
доктар юрыдычных навук,
прафесар.

## Вялікае бачыцца на адлегласці...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

цыі Герат. Над ёю цяжка вісела заслона пылу. Натужліва раўлі маторы машын, у кузавах якіх былі хлеб і медыкаменты для афганскіх сяброў. Гарачыня каля пяцідзесяці, хочацца спыніцца, перадыхнуць, але калона паволька паўзе да горада, дзе яе чакаюць. Нечакана па галаўному «Зілу», які вёў мой сябар Зейнула Шарыкбаеў, ударылі аўтаматныя чэргі душманаў. Білі прыцэльна, па адной машыне, ведаючы: калі спыніцца першая, то і астатніяператворацца ў нерухомыя мішэні. Кулі крышылі шкло, рвалі на кускі абшыўку, а машына ішла і ішла наперад. Калі выйшлі з-пад абстрэлу, па рацыі перадалі: «Прывал». Усе спыніліся, а галаўная машына, праехаўшы яшчэ крыху, уткнулася ў скалу. Падбеглі, адчынілі дзверцы: на сядзенні, адкінуўшыся, напаўляжаў Зейнула Шарыкбаеў, пабялеўшыя рукі мёртвай хваткай сціскалі руль.

Ён атрымаў шмат ран. Адна з іх была смяротнай, але яшчэ паўтара кіламетра вёў машыну. Паўтара кіламетра вялікае і мужнае сэрца шчуплага з выгляду казаха, слабеючы, выстуквала словы: «Гэта твой абавязак! Гэта твой абавязак! Гэта твой абавязак!...»

А ці гучала хоць раз гэта пульсуючая фраза ў сэрцах выхваляюцца адзін перад другім такія хлопцы. Наўрад! Маральныя асновы і прынцыпы фарміруюцца не раптам, не ў адно крытычнае імгненне.

Не хачу ўтойваць, былі і ў нас хлопцы, не гатовыя да цяжкасцей. Адзін, з былых рокераў, у час бою пакінуў рацыю, таму што яму раптам стала цяжка яе несці. Каб паведаміць нашы каардынаты камандаванню, за рацыяй пайшлі двое. Назад яны вярнуліся з перадатчыкам і ранамі ад душманскіх куль. Пасля перавязкі юнакі сказалі ўсяго адно слова: «Здраднік!».

Нядаўна ўбачыў, як каля сталоўкі некалькі студэнтаў штурхалі нагамі чэрствы батон. На іх тварах была весялосць. І больш нічога. А перада мной праплылі твары афганскіх дзяцей з кішлака Зерджа ля Герата. Галодныя, худыя. Абпальваў душу іх хрыплы недзіцячы шэпт:

— Нан! Нан! Хлеба!

Аддалі ім увесь паёк, але малыя не дакрануліся да тушонкі, цукру, кашы, а ўсё грызлі і грызлі салдацкія сухары...

Мы старанна беражэм дзяцінства. Але ці не нагадвае яно часам вялікі парнік? Згадзіцеся, у падрастаючага пакалення вольнага часу дастаткова. І калі не зоймеш яго карыснай справай, яно само па сабе запаўняецца пустатой вуліцы ці магнітафонным выццём якога-небудзь чарговага «Хэві металл».



тых юнакоў і дзяўчат, якія губяць адзін раз дараваную ім маладосць на пошук крывых сцяжынак да «салодкага» жыцця? Яны знаходзяць сотні прычын, каб ухіліцца ад сапраўднай справы, жывуць з аглядкай, перастрахоўваюцца, шукаюць цёплае месца. А мэта жыцця зводзіцца да даставання «фірменных рэчаў». З некаторага часу я не магу абыякава, як некалі, глядзець на маладых людзей у майках з эмблемамі амерыканскіх войск, штанах з фірменнай пячаткай «Зроблена ў ЗША». Гэтыя анучы для мяне нібы крывёю пахнуць. Дакладна такое ж кляймо стаяла на стабілізатары міны, якая перакрэсліла жыццё сябра і адзінага ў роце земляка майго Валодзі Ляха.

Не бачылі гэтага «модныя» хлопцы з так званых «рокераў», «металістаў», «панкаў». Магчыма і не фанабэрыліся б тады сваімі ўзлахмачана-падголенымі прычоскамі і атрыбутамі «мужнасці» — курткамі, скляпанымі мэблевымі цвікамі і металічнымі ланцугамі, на якіх хіба што трымаць вартаўнічых сабак.

Што гэта — жаданне самасцвярдзіцца? Калі ласка, самасцвярджайся! У вучобе, працы, спорце, грамадскай рабоце. Навошта ламацца ў жыцці пад грукат металічнага року, без пэўнай мэты, калі ў цябе ёсць усе магчымасці атрымаць бясплатна веды, прафесію, сумленнай працай заваяваць павагу людзей, ды і матэрыяльныя выгады.

«Калі спатрэбіцца, мы таксама пойдзем пад кулі»,—

Вось дзе адна з важнейшых кропак прыкладання энергіі для камсамольцаў. Упэўнены, пасля XX з'езда ВЛКСМ многае зменіцца. Не можам стаяць ўбаку ад гэтага і мы, тыя, хто пад кулямі пазнаў, якім павінен быць сапраўдны сябар. Нам ёсць аб чым расказаць, ёсць чым падзяліцца з маладымі».

Замест пасляслоўя да адкрытага пісьма кавалера ордэна Чырвонай Зоркі Аляксандра Дземяшкевіча:

...У той дзень Саша разам з танкістамі забяспечваў размініраванне горнай дарогі. Ад двух пападанняў з душманскага гранатамёта танк успыхнуў. Аляксандр быў на брані. Прамільгнула думка: «Прыгаць!..» Але члены экіпажа заставаліся ўнутры палаючай машыны. І тады Дземяшкевіч нырнуў у вежавы люк. Выцягнуў аднаго. Успыхнуў камбінезон. Выцягнуў другога. Загарэліся валасы. Але зноў, мацней сціснуўшы пачарнеўшыя губы, палез салдат у танк. Як выцягнуў апошняга — не памятае... У шпіталі даведаўся, што за гэты бой узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Крыху падлячыўся і, захапіўшы з сабой як мага больш бінтоў, уцёк на спадарожным бронетранспарцёры ў сваю роту...

Напісаць гэта пісьмо таварышу па вучобе дапамог **В. БАГДАНОВІЧ,**
студэнт факультэта журналістыкі.

## твая жыццёвая пазіцыя

Да мяне раптам падбегла дзяўчынка і, працягнуўшы ручку, пяшчотна дакранулася. Я ўсміхнулася, не ведаючы, што ёй сказаць, а ўнутры ўсё сціснулася — такой даччынай была гэтая ласка і такімі нечаканымі словы: «Прыходзь да нас яшчэ. І будзь маёй мамай...»

# «Будзь маёй мамай»

А КОЛЬКІ разоў чулі такія просьбы байцы атрада імя 3 ліпеня! Гэта і ёсць, напэўна, самае цяжкое, з чым сутыкнуліся яны ў дзіцячым доме № 2 г. Мінска. Бо можна прывыкнуць уставаць у шэсць гадзін раніцы і працаваць ноччу, можна прымусіць сябе «не бачыць» затоены сум у вачах дзяцей, «не чуць» нечага ўсхліпвання ў цемры пакоя, дзе цябе папрасілі расказаць казку, але да дзіцячых горкіх пытанняў пра тату і маму і такіх вось просьбаў не прывыкнеш.

Сёлета выхавацелямі ў дзіцячы дом іх не ўзялі. І тады байцы атрада згадзіліся на месцы абслугоўваючага персанала. Праўда, з сарака чалавек тут працуюць толькі восем, астатнія ўладкаваліся ў дзіцячыя садзікі, а па суботах прыходзяць па чарзе ў дзіцячы дом № 2 і замяняюць сваіх таварышаў.

Раніцай Алена Пяткевіч бярэ вядро з вадой і анучу, пачынае наводзіць чысціню ў калідоры і кабінетах. Аня Шкода мые посуд на кухні. За Пецем Арленкам — парадак ў двары. Вартаўнікамі працуюць Сархан Ісфандзіяраў і Віця Красноў, нянечкамі — Ала Ксяндзова, Марына Бацян, Андрэй Дзевяцісільны. Працуе тут і Ала Стрыга. Ёй як «старажылу» атрада і яго цяперашняму камандзіру трэба паспяваць усюды.

...Было вельмі прыемна, калі іх пазнавалі дзеці. Сархан, Віця, Аня і Ала тут ужо працуюць другое лета. Значыць, запомнілі іх. А запомнілі таму, лічыць дырэктар дзіцячага дома Аляксандр Уладзіміравіч Пятроў, што студэнты ўмеюць з імі размаўляць, і наогул — з дзецьмі ў іх атрымліваецца...

Да Марыны Бацян падыходзіць хлопчык:

— Цёця Маша, а вы мяне любіце?

— Я ўсіх люблю.

— Не, я так не хачу, любі мяне болей, чым усіх.

Марына згадзілася, толькі просіць трымаць сваё абяцанне ў тайне:

— Няхай гэта будзе нашым з табой сакрэтам.

На абласны злёт атрадаў бязвыплатнай працы юрфакаўцы прыехалі разам са «сваімі дзецьмі». Малыя пелі, танцавалі, чыталі вершы, наогул, са студэнтамі ім было добра і весела.

Аднойчы Света прыйшла з кухні са слязьмі — пасварылася з супрацоўніцай дзетдома. Дзяўчынкі сталі яе супакойваць, а хлопчыкі, аб нечым пагаварыўшы паміж сабой, накіраваліся «правучыць» крыўдзіцельку. Жанчына сама потым, давячыся ад смеху, расказвала, як малыя прыйшлі з ёй разбірацца.

Даўно вядома ісціна: з чым ты да дзіцяці прыходзіш — тым ён табе адкажа. На ласку адказвае любоўю, на сардэчнасць адгукаецца дабрынёй.

Байцы атрада імя 3 ліпеня адчуваюць сябе ў дзетдоме не часовымі наведвальнікамі. Няма ўрача — і студэнты ўжо турбуюцца не менш дырэктара. Андрэй Дзевяцісільны ўпэўнены: дзеці ў дзетдоме маюць патрэбу ў мужчынах, а тут, акрамя дырэктара Аляксандра Уладзіміравіча, усе — жанчыны.

Летась байцы атрада купілі ў дзетдом чатыры дываны на падлогу. А цяпер — мараць з дапамогай універсітэта набыць яшчэ і аўтобус.

Неяк Алу Стрыга спыталі: «Адкуль у вас гэты клопат аб дзетдоме, імкненне абагрэць дзяцей? Вы ж такія маладыя... Можа самі з дзіцячага дома?»

Не, ні Ала і ніхто іншы са студэнтаў не дзетдомаўскія. Не хочацца гаварыць красамоўных слоў. Хочацца проста заўважыць, што прыходзяць сюды студэнты не па абавязку, а па закліку душы.

У свабодныя ад працы мінуты яны вельмі любяць гаварыць пра сваіх дзяцей. І таму, ужо развітваючыся з байцамі студэнцкага атрада імя 3 ліпеня, я занатавала ў блакнот іх успаміны.

— А помніш, як Ромка ўзлез на аўтамабіль у двары і вырашыў на ім станцаваць?

— Сярожка вымазаўся ў фарбу, і такімі ж мурзатымі захацелі быць і ўсе астатнія. Чаго каштавала іх потым адмыць!

— А памятаеце, як мы лазілі на дрэвы, каб зняць адтуль нашых малых?..

В. ПАКЛОНСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Мая радзіма — Малі, былая французская калонія, цяпер незалежная афрыканская рэспубліка. З вялікай павагай ставяцца мае суайчыннікі да народных традыцый, святаў, беражна збіраюць і захоўваюць старыя песні, танцы. Бо ўсё гэта — гісторыя народа, адлюстраванне яго духоўнага жыцця.

# Калі надыходзіць «Біеналь»

АСАБЛІВАЕ месца займае на маёй радзіме «Біеналь» — свята культуры і мастацтва. Адбываецца ён штогод у ліпені пачаргова ў адным з сямі буйнейшых гарадоў краіны, уключаючы і сталіцу — Бамака. Збіраюцца на яго ўсе фальклорныя ансамблі з самых аддаленых куткоў. У дзень адкрыцця жыхары горада, спецыяльна прыехаўшыя «балельшчыкі» ансамбляў збіраюцца на стадыёне. Перад імі ў маляўнічых касцюмах праходзяць удзельнікі фестывалю. З прывітальным словам выступае перад прысутнымі міністр культуры...

Але вось пачынаецца самае цікавае — карнавал. У нас гэта завецца «разбудзіць горад». Перакрыты галоўныя вуліцы, па іх з песнямі, танцамі рухаецца убраны натоўп. Тут можна ўбачыць нацыянальныя касцюмы ўсіх народнасцей Малі. Малюнак на жаночай «пане» — сукенцы — дакладна вызначае, з якога рэгіёна краіны прыбылі госці: маіс і рыс ці баабаб — значыць, з Сегу, рыба і карова — з Мопці...

У наступныя дні ў Палацы культуры адбываецца конкурс фальклорных ансамбляў. Іх вельмі шмат, але ў кожнага — свая песня, свой танец. Каб назваць лепшых, журы і гледачы ўважліва адносяцца да ўсіх выступленняў.

На конкурс прывозяць шмат новых песень — пра любоў, дружбу, аб патрыятызме і афрыканскай гасціннасці, з заклікамі мацаваць адзінства кантынента, энергічна ўдзельнічаць у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны... Усе яны вытрыманы ў духу народных традыцый, таму што не дарма гавораць у нас, што чалавек, які забыўся на звычаі народа, падобны дрэву без кораняў.

Тыдзень працягваецца конкурс. А потым усе зноў збіраюцца на стадыёне. Міністр культуры называе лепшыя ансамблі, лепшыя песні, вітае пераможцаў. Заканчваецца «Біеналь», як і пачынаўся,— вясёлым карнавалам.

Толькі позняй ноччу сціхае горад. Свята канчаецца, каб вярнуцца роўна праз год і прынесці з сабой новыя песні, танцы, жарты, смех і радасць.

Абдулай КУЛІБАЛІ,
студэнт факультэта журналістыкі.



спыніся, імгненне!

Фота Г. БАБКІНА.

## З нашай пошты

# Першае лета «ФЕМІДЫ»

### УСЁ СПАСЦІГАЛАСЯ Ў РАБОЦЕ

НА ПЕРШЫ погляд, наш атрад нічым не адрозніваўся ад астатніх: працавалі паударнаму, цікава праводзілі вольны час. Толькі ўсё гэта для байцоў «Феміды» было ўпершыню: першы выхад у поле, першы сход, першае выступленне агітбрыгады... Атрад сфарміраваны так, што і камандзір і камісар ні разу не былі нават байцамі сельскагаспадарчага атрада. Таму нам спачатку было вельмі цяжка. Тэарэтычны курс мы прайшлі ў падрыхтоўчы перыяд, а вось практычны... Давялося ўсё спасцігаць у час работы.

У асноўным наш атрад працаваў на прапалцы сталовых буракоў. Хутка і якасна выконвала работу брыгада Наталлі Хмялеўскай, у састаў якой уваходзілі Нона Данільчык, Ганна Шынкевіч і Алена Емяльянава

Акрамя гэтага, мы працавалі яшчэ і на збожжатаку. Работа была кругласутачнай, у некалькі змен. Водгукі атрымалі толькі добрыя.

### У ГОСЦІ ДА ВЕТЭРАНА

ПАСЛЯ работы мы хадзілі дапамагаць ветэрану Вялікай Айчыннай вайны. Дарога не блізкая: чатыры кіламетры. Але для нас, вядома, гэта не перашкода. Мы былі рады кожнай сустрэчы з такім цудоўным чалавекам, як Іван Антонавіч Абрамчык. Яго паважаюць у саўгасе. У мінулым — камандзір партызанскага атрада, потым — кіраўнік гаспадаркі. Зараз ён мае патрэбу ў дапамозе, і мы рады, што можам быць карыснымі.

Бываючы ў Абрамчыкаў, пераканаліся, што гэта душэўныя, шчырыя і сціплыя людзі. Кожная такая сустрэча напаўняла нашы сэрцы радасцю і цеплынёй.

### НА РАДЗІМЕ ГЕРОЯ

НАДОЎГА запомніцца нам паездка на радзіму ганаровага байца атрада Мікалая Чэпіка.

Мітынг памяці... Застылі ў маўчанні камсамольцы. Для нас, студэнтаў юрыдычнага факультэта, з імем Мікалая Чэпіка звязаны асаблівыя пачуцці. Ен — прыклад выканання грамадзянскага абавязку. Асабліва для воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія вучацца на факультэце. Як даніна памяці адважнаму герою-равесніку прагучала выступленне агітбрыгады атрада.

Грошы, заробленыя за ганаровага байца, мы пералічылі ў фонд музея М. Чэпіка на радзіме героя.

### НАДЗЕЙНЫ СЯБАР — ГІТАРА

У ЧАС трэцяга працоўнага мы не толькі працавалі, але і выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці перад мясцовымі жыхарамі, удзельнічалі ў святце зажынак.

Вялікую дапамогу нам аказаў сакратар камсамольскай арганізацыі саўгаса «Гарадок» Сяргей Козіч. На любую нашу просьбу ён адказваў: «Абавязкова дапамагу, будзе зроблена». І гэта не проста словы, гэта — прынцып работы камсамольскага важака. Ні адзін канцэрт ці дыскатэка не абыходзіліся без яго дапамогі. Ён абавязкова прыносіў магнітафон ці гітару. Спатрэбіліся нам фотаздымкі для газеты — зноў усё неабходнае прапанаваў Сяргей.

Дні праляцелі непрыкметна. Завяршаецца трэці працоўны, а разам з ім і першае незабыўнае лета «Феміды»

Н. ХІЛЬ,
камісар атрада «Феміда».

## свет тваіх захапленняў

**Народны ансамбль танца БДУ імя У. І. Леніна «Крыжачок» за свае больш як сорак гадоў заваяваў вядомасць і славу. Ён — лаўрэат першага Усесаюзнага конкурсу народнай творчасці, член міжнароднай асацыяцыі студэнтаў, удзельнік культурнай праграмы XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. «Крыжачок» знаёміў са сваім мастацтвам гледачоў Балгарыі, ГДР, Аўстрыі, Новай Зеландыі, Аўстраліі, Анголы. Маршрут наступнай паездкі студэнцкага калектыву — Ісландыя. Як рыхтуюцца да яе ўдзельнікі ансамбля? Заглянем на рэпетыцыю...**

# У пошуках дасканаласці



У спартзале ссунуты снарады, складзены маты, перад велізарнымі, на ўсю сцяну люстэркамі размясціліся юнакі і дзяўчаты. Акампаніятар ударае па клавішах — урок пачаўся.

— Першая пазіцыя. Раз, два, тры, чатыры...

Быццам дырыжор у аркестры, сочыць за ўсімі рухамі ансамбля кіраўнік. Зноў і зноў паўтараюцца практыкаванні для рук, ног, корпуса, кампазіцыі, якія павышаюць каардынацыю рухаў, выпрацоўваюць вынослівасць. Толькі праз сорак пяць мінут закончыцца размінка і будзе аб'яўлен кароткі перапынак.

Што прымушае студэнтаў працаваць з такім захапленнем, адкуль гэта адданасць танцу?

— Танец даўно стаў для мяне патрэбнасцю,— гаворыць студэнтка хімічнага факультэта Алена Шахоцька.— Пачынала я ў дзіцячым ансамблі пры Палацы культуры МАЗа і цяпер ужо не ўяўляю сваё жыццё без танца. У ім я магу выразіць свае пачуцці, перадаць радасць, адчуванне прыгажосці. Але каб навучыцца ўсяму гэтаму, трэба працаваць і працаваць. Звычайна рэпетыцыі бываюць два разы ў тыдзень, а калі пачынаюцца выступленні, значна часцей. Галоўнае тут — правільна размеркаваць час паміж вучобай і захапленнем.

Наталля Янушкевіч, староста ансамбля, ужо закончыла універсітэт, працуе тут жа на кафедры палітэканоміі.

— Вучэбныя заняткі, грамадская работа, рэпетыцыі — вядома, цяжка ўсё гэта сумяшчаць,— гаворыць яна.— Але як бы там ні было, ніколі не прыходзіла нават думка кінуць танцаваць. Ансамбль падарыў нам столькі цікавых паездак, сустрэч, новых сяброў. Самыя добрыя адносіны падтрымліваем з танцавальнымі калектывамі Ужгарадскага, Вільнюскага, Кішынёўскага універсітэтаў.

— Адпачылі?— перапыняе нашу размову голас Мікалая Васільевіча Харламава, кіраўніка «Крыжачка».— Тады пачалі! Дзяўчаты, галаву, галаву трымайце...

Партнёры падхопліваюць дзяўчат за таліі і з дзівоснай лёгкасцю, выстукваючы чаравічкамі, яны нясуцца па зале. Па-мойму, усё цудоўна. Але не паспеў танец набраць сілу, як Мікалай Васільевіч жэстам спыняе музыку— штосьці не так. Разбіраецца кожны рух, памылкі недапушчальныя, бо недакладнасці, дрэннае выкананне ні гледачу, ні самому танцору радасці не прыносяць.

— Прыемна працаваць з такім калектывам,— гаворыць М. В. Харламаў.— Рабяты дружныя, здольныя, ёсць кім ганарыцца. Але ў танца, як у любога мастацтва, няма і не можа быць закончанай формы, апошняй ступені дасканаласці. Жыццё рухаецца наперад, прыходзяць новыя людзі, таму зрабіць трэба будзе значна больш, чым ужо зроблена.

В. КАРПОЦКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Сто тысяч дорог позади
Далеко, далеко, далеко.
А что там еще впереди?
Дорога, дорога, дорога.
В. ВЫСОЦКИЙ.

рэха працоўнага семестра

# ЛЕТА НА КОЛАХ



## Цікавае запрашэнне

ПРАПАНОВА аказалася нечаканай, дарэчы, адначасова прывабнай для мяне. Юрыю Сцепанчуку мусіць абрыдлі мае шматлікія пытанні і ён параіў:



— Лепш паехалі разам. У дарозе ўсё і пабачыш, а пажадаеш, дык і сам паспрабуеш смак нашага праваднiцкага хлеба. Часу для гэтага будзе шмат, шлях — няблізкі.

З такога вось нечаканага запрашэння і пачалося маё знаёмства са студэнтамі атрада імя Фрыца Шменкеля, якія другі год працуюць праваднікамі на Беларускай чыгунцы. Праца іх, як і ўсякая іншая, мае сваю спецыфіку: кожны рэйс непаўторны, ба-



гаты на сустрэчы з рознымі людзьмі. Праца, у якой бываюць горыч і радасць, слёзы і жарт, і самыя неверагодныя здарэнні.

І калі сам не паспрабуеш гэтага, тады ніколі не зразумееш, чаму так нярэдка аказваюцца недаўгавечнымі словы: «Ну, усё, хопіць, апошні раз ездзіў!», пасля якіх ... надыходзяць зборы ў новы рэйс. А калі наступае вучэбны год, дзяўчаты і хлопцы зноў з нецярпеннем чакаюць працоўнага лета. Дзяўчаты жартуюць:

Мы почти что стюардессы,
Только ходим по земле.
И у наших ног Одесса,
Киев, Адлер и т. д.

— Не магу не ехаць,— адказвае на пытанне аб прычыне такой прываблівасці кожны з іх,— сплаціліся ўжо. Цяпер цяжка ўявіць сябе без усяго гэтага.

— Праца вельмі цікавая, хаця ўсякае бывае...

— Гэта трэба бачыць усе сваімі вачыма,— абавязкова дадасць яшчэ хто-небудзь.

Згодны. Хай на ўсе пытанні дасць адказ дарога і самі рабяты.

Але спачатку для знаёмства невялікае адступленне.

## Кароткая даведка аб атрадзе

ЯЕ ДАЕ камандзір атрада Людміла Блазнік. Яна праводзіць і сустракае з рэйса кожную брыгаду.

— Калі ў мінулым годзе мы ўзяліся за гэтую незнаёмую нам раней працу, многіх спачатку вабіў рамантычны бок справы. Правесці лета ў падарожжы, праехаўшы і пабачыўшы шмат новых мясцін,— пра гэтае марылі многія. Але ўжо падрыхтоўчы перыяд прадэманстраваў, што справа мае і другі бок. Хаця да нас ў атрад нялёгка трапіць: на 50 месц заяў падаецца ў некалькі разоў болей. Атрымліваецца своеасаблівы конкурс. Улічваем ранейшую працу, характар, дысцыплінаванасць, здольнасці ў самадзейнасці. Памылак пасля гэтага амаль не бывае, у выніку збіраецца згуртаваны, цудоўны калектыў.

Але толькі трапіць у атрад пасля дакладнага адбору аказваецца не самым галоўным. Пасля гэтага наступае месяц падрыхтоўкі, які завяршаецца экзаменамі. Ужо тут некаторыя «рамантыкі» будуць вымушаны развітацца з атрадам. Экзамены з яваяцца неабходнай кропкай у фарміраванні канчатковага саставу атрада. Наогул, падрыхтоўчы перыяд прыносіць шмат клопатаў і хваляванняў кожнаму. Чаго каштуюць толькі конкурсы агітбрыгад або газет! Алена Мароз, адказная за самайдзейнасць, ужо ў лютым пачала «хвалявацца», рыхтуючы сцэнарый. Рабілі яго ўсе разам. І на конкурсе агітбрыгад горада Мінска невялікі калектыў з сямі чалавек заняў II месца і I месца ў занальным штабе сярод атрадаў праваднікоў. Хвалююча праходзяць і пробныя рэйсы разам з прафесійнымі праваднікамі, пасля чаго мы атрымліваем нарэшце дазвол на самастойную працу.

Для брыгады, якая абслугоўвае рэйс №№ 234 — 233 «Мінск—Новарасійск», працоўны семестр адразу стаў шчаслівым. За ліпень пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва сярод брыгад яны зоймуць I месца.

— Калі пачалі падводзіць вынікі,— дадае Святлана Сіяновіч, камісар занальнага штаба,— улічваючы паказчыкі ў вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці па тэхніцы бяспекі, брыгада ў спаборніцтве падрыхтоўчага перыяду заняла II месца. Па традыцыі ім было прадастаўлена права самім выбіраць рэйс. Яны выбралі адзін з лепшых: «Мінск — Новарасійск».

## Смак праваднiцкага хлеба

ЦЯГНІК, прывычна скалануўшы ўсім саставам, асцярожна развітаўся з прыгарадам, хутка надаў ходу. Наперадзе — сотні кіламетраў і пакуль што поўная невядомасць. Колы старанна выстукваюць сваю спрадвечную песню, пад якую пачынаюць працу праваднікі вагона № 2 Юрый Сцепанчук і Антаніна Сіняк. На дзвярах праваднiцкага купэ, акрамя стаўшага звыклым для пасажыраў за лета паведамлення аб абслугоўванні іх студэнтамі, яшчэ адзін надпіс: «РЭЙС МІРУ». Гэта ўжо другая паездка па ініцыятыве брыгады, частка заробленых грошай ад якой будзе пералічана ў адпаведны фонд.

Начальнік цягніка звыкла абыходзіць састаў, дае апошнія распараджэнні. Галоўнае з іх — каб своечасова падаваліся звесткі аб наяўнасці свабодных месц. Гэта вельмі сур'ёзная і неабходная заўвага, з якой пачынаюць кожную сваю праверку кантралёры. А яны, выяўляючы «зайцаў», сочаць за гэтым вельмі дакладна. І не пазайздросціць вам ніхто, калі вы ў сваіх запісах дапусцілі памылку. Але сённяшні рэйс абыходзіцца пакуль што без выпрабаванняў кантралёрамі. Чакалі іншыя непрыемнасці. Перад Гомелем давялося высадзіць аднаго «таварыша» у нецвярозым стане.

Нідзе так хутка не знаёмішся, як у дарозе. Здаецца, раніцай толькі выехалі, а ўвечары я ўжо ведаў патроху пра кожнага.

Юра Сцепанчук, намеснік камандзіра, у рэйсе выконвае абавязкі брыгадзіра, адказны за ўсіх, а таксама за ўсё. І з усімі сваімі шматлікімі абавязкамі спраўляецца ўдала. Вось некалькі слоў аб ім ад саміх рабят.

— Падабаецца, што заўсёды вясёлы. Любіць, умее пажартаваць. Але ў той жа час і патрабавальны. Спытае, калі трэба, вельмі строга. З ім цікава працаваць.

Мы дамовіліся, што ён пазнаёміць мяне са шматлікімі бакамі сваёй працы. Вось некаторыя з іх.

— Што самае нежаданае ў працы праваdніка?

— З цягам часу гэта не мяняецца — «двайнікі». Высадзіць такога пасажыра нельга, трэба шукаць яму месца. І гэта летам, калі цягнікі ходзяць заўсёды паўнюткія. А людзі ў такіх выпадках



нічога не хочуць разумець. Ім давай месца і ўсё тут. Ад праваdніка ў такіх выпадках патрабуецца добрая вытрымка. Тут, як лічаць у брыгадзе, без гумару не абысціся. Ён вельмі дапамагае. Успамінаецца такі выпадак. Аднойчы была пасадка ў дзве гадзіны ночы. Пасажырам выдалі бялізну, яны рыхтаваліся спаць. Адзін з іх спытаў: «А гарбата дзе?» Яму ў адказ: «Гарбаты няма, замест яе можам прынесці каву ў ложак». Праходзіць паўгадзіны Ён зноў пытаецца: «Мне яшчэ доўга чакаць?» Давялося растлумачыць, што мы пажартавалі.

Але ёсць ва ўсім гэтым іншы бок справы. І ён якраз галоўны. Маючы справу са шматлікай колькасцю людзей, пачынаеш лепей разбірацца ў іх характарах. Валянціна Ратнікава добра заўважыла: «Для мяне раней усе людзі былі на адзін твар. А зараз магу ўжо пры пасадцы, назіраючы за пасажырамі, уявіць, хто і як будзе сябе весці».

## Пасажыры. Якія яны ёсць

ЧАГО толькі не пабачыш, працуючы на чыгунцы! Аб адных толькі здарэннях з пасажырамі можна расказваць бясконца.

Вось і ў нашым рэйсе. Адзін з пасажыраў пачаў выдаваць нейкія гукі. Доўга так. Мы паспрабавалі яго суцішыць: «Грамадзянін, калі ласка, спыніце свае завыванні!». «Вы нічога не разумееце ў сапраўднай музыцы»,— пачулася ў адказ. І раптоўна палілася чулая, прыгожая песня. Аказалася, пасажыр наш незвычайны — спявае ў тэатры музычнай камедыі. Яго спевы ацаніў увесь вагон, выключылі нават радыё. Развіталіся ўжо добрымі знаёмымі, абмяняліся адрасамі. Іх шмат набярэцца ў кожнага з брыгады. Але не меней сустрэч і менш прыемных.

Ехаў пасажыр з японскім тэлевізарам. Лічыў, што грошы робяць усё. Багаж яго аказаўся негабарытным. Ён яго зацягнуў толькі ў тамбур, дзе па інструкцыі нічога заставацца не павінна. Яму параілі распакаваць і перанесці ў вагон. Але ніякіх прапаноў ад праваднікоў Барыса Паўса і Ганны Кімстач ён і слухаць не жадаў.

— Я з ім з Поўначы. Праехаў шмат. І ўсюды было можна. Колькі вы жадаеце, каб я вам заплаціў? 100? 200?

Пачаўшы такі зняважлівы дыялог, ён усё ж хутка змоўк. Праваднікі настаялі на сваім.



Даўно заўважана: калі цягнік абслугоўваюць студэнты, узровень іх работы рэдка бывае ніжэйшым за прафесійны, а часта і вышэйшым.

Гартаю старонкі «Кнігі водгукаў...» За два гады працы ніводнай скаргі на дрэннае абслугоўванне. Адны падзякі. Вось адна з такіх.

«Шчыра дзякуем праваднiку вагона № 10 Барысу Паўсу за ўважлівыя адносіны да пасажыраў. Своечасова праводзілася ўборка вагонаў, падаваўся чай, хаця яго прыходзілася насіць з суседняга вагона».

Святлана Ціханаўна МАНЯК, г. Мінск.

«Прафесійна неабыякавая»,— так сказала пра Марыну Зуёнак адна з пасажырак.— Ведаеце, я шмат паездзіла і з сумам магу заўважыць, што гэтага ўсё менш менш застаецца ў людзях. Такая рыса прысутнічае і ў характары Ірыны Рак, якая ўступіла аднаму з «двайнікоў» сваё месца, хаця і не была абавязана гэтага рабіць.

## Усякае падарожжа мае канец...

РЭЙС прайшоў гэтак жа хутка, як і пачаўся. Мільгануў адзін дзень у Новарасійску, а ўвечары яны стаялі ўжо, апранутыя ў форму, сустракаючы пасажыраў. Цягнік вяртаўся дадому. Зноў Юра звыкла пройдзе па вагонах і раздасць малым алоўкі і паперу, каб тыя малявалі свае ўражанні. Потым яны аформяць газету з гэтымі малюнкамі. Кніга водгукаў папоўніцца яшчэ некалькімі старонкамі ўдзячнасці. А ў начны час ніхто з пасажыраў не праспіць сваю станцыю...

Непрыкметна канчаецца і рэйс «Лета на колах». Са сваімі радасцямі і няўдачамі. Але дзякуючы сяброўству рэйс №№ 234—233 «Мінск — Новарасійск» для іх назаўсёды застанецца ў памяці. З усім тым добрым і дрэнным, з чым прыйшлося сутыкнуцца ў дарозе, каб яшчэ лепш зразумець сябе і іншых. Такое не забываецца.

Тэкст і фота
А. МАКСІМАВА.
Новарасійск — Мінск.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
31 жніўня 1987 г.
Зак. 1587.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.